■ Беларусікі

# НЯСТОМНЫ ВАНДРОЎНІК

**«Першы наш буйны «выхад у свет» з маленькім Паўлікам быў у пазамінулым годзе, на свята 9 Мая. Сыночку тады было 7 месяцаў і большасць святочных падзей ён... праспаў, — піша Ірына, матуля Паўліка Плецяжова з Гомеля. —**



**Затое летась на тое ж свята малы ўжо весела тупаў па залах музея вайсковай славы. А сёлета, несумненна, аблазіць усю выстаўку баявой тэхнікі! Мы з Паўлікам любім падарожнічаць. Пакуль што вандруем па Гомельскай вобласці, без аўто — на цягніку, маршрутках. Пабывалі ўжо ў Добрушы, дзе знаходзіцца будынак папяровай фабрыкі, узведзены ў канцы XIX стагоддзя, у Калінкавічах...»**

*Шаноўныя мамы і таты, бабулі і дзядулі! Шчыра запрашаем вас прыняць удзел у конкурсе «Беларусікі». Дасылайце здымачкі вашых дзетак, унукаў, а можа, нават і праўнукаў (з невялічкім апаведам) на адрас «Звязды». Але адна ўмова — каб, зірнуўшы на фота, адразу ж можна было зразумець, што гэта беларусік. Арыгінальнасць і творчы падыход вітаюцца! Аднаго з герояў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз!*

■ Увага! Новы конкурс!

# Як запомніць колеры вясёлкі



Днямі я з дзецьмі маіх сяброў — амаль трохгадовай Юстынкай і пяцігадовым Янкам — малявала вясёлку. І мне захацелася падказаць ім, як лёгка запомніць колеры і іх паслядоўнасць. Першае, што прыгадалася: «Каждый Охотник Желает Знать Где Сидит Фазан» і «Как Однажды Жак Звонарь Головой Сломал Фонарь». Гэтыя запаміналкі, думаю, ведаюць усе з дзяцінства. Але ж мае сябры выхоўваюць дзяцей па-беларуску, таму захацелася прыдумаць штосьці сваё, адметнае. Вось што ў мяне атрымалася: «Чароўны Аловак Жаданне Здзейсніць, Бо Сам Фантазёр» (першыя літары кожнага слова з'яўляюцца першымі літарамі колеру: чырвоны — аранжавы — жоўты — зялёны — блакітны — сіні — фіялетавы). Потым ужо знайшла ў вікіпедыі іншыя падказкі:

- чалавек абачлівы жонку заўсёды сабе бярэ файную;
- чаму птах журботны зранку? Бо сапсута філіжанка;
- чэшскі пан жадае зноў бачыць сорак фазаноў;
- чакаю апетытных жабак з беларускіх сажалак. Француз.

І вось (дарэчы, у дзень роднай мовы) у мяне нарадзілася ідэя правесці конкурс сярод чытачоў «Сямейнай газеты» на найлепшую беларускамоўную падказку-запаміналку паслядоўнасці колераў вясёлкі. Мамы і таты, бабулі і дзядулі, прыдумляйце самі і падключайце сваіх дзетак. Пераможцу чакае неймаверна душэўны прыз (на фота) — экалагічная цацка з дрэва. Свае «вясёлкавыя» варыянты дасылайце на адрас «Звязды» альбо па электроннай пошце nadzieja@zviazda.by

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.** *dryla@zviazda.by*

■ Шпаргалка для дарослых

# 20 СПОСАБАЎ ДАВЕДАЦЦА, ЯК СПРАВЫ Ў ШКОЛЕ,

## не пытаючыся «Ну, як справы ў школе?»

**Калі вы спытаеце ў дзіцяці: «Ну, як там у школе?», то, хутчэй за ўсё, пачуеце ў адказ дзяжурнае: «Нармальна». Многія бацькі задавальняюцца гэтым і працягваюць спакойна займацца сваімі справамі. І дарэмна. На такіх адносінах давер не пабудуеш. З дзецьмі трэба размаўляць на розныя тэмы штодзень, нягледзячы на занятасць і стомленасць. Інакш яны, і гэта непазбежна, будуць аддаляцца. Калі ж вы сапраўды хочаце даведацца, як прайшоў дзень у вашага сына (дачкі), то задайце такія пытанні, на якія яму (ёй) цікава будзе адказваць. Вось толькі некалькі магчымых варыянтаў — своеасаблівая міні-шпаргалка, якую вы можаце дапаўняць і змяняць самі ў залежнасці ад сітуацыі і ўзросту вашых дзяцей:**

1. Што самае добрае з таго, што адбылося з табой сёння ў школе?
2. Што найгоршае з таго, што адбылося з табой сёння ў школе?
3. Цябе штосьці сёння насмяшыла? Раскажы пра гэта.
4. Калі б ты мог выбраць, з кім бы ты хацеў сядзець у класе за адной партай?
5. А з кім бы не хацеў сядзець? Чаму?
6. Раскажы мне пра самае цікавае месца ў школе.
7. Калі б мы запрасілі сёння твайго настаўніка да нас у госці, што б ён мне расказаў пра цябе, як думаеш?
8. Каму ты сёння дапамог?
9. Можа, хтосьці табе сёння дапамог?
10. Раскажы мне, што новага ты даведаўся сёння?



11. Ці быў момант, калі ты адчуваў сябе самым шчаслівым сёння?
12. Што сёння было самым сумным у школе? Ці было табе сёння сумна?
13. З кім бы ты хацеў пагуляць на перапынку з тых, з кім ты яшчэ ніколі не гуляў?
14. Пра што ты яшчэ больш хацеў бы даведацца ў школе?
15. Чаго б табе хацелася менш рабіць у школе?
16. Чым ты часцей за ўсё займаешся на перапынках?
17. Хто самы смешны вучань у вашым класе? Чаму ён такі смешны?
18. Табе спадабаўся сённяшні абед? Што больш за ўсё спадабалася?
19. Ты лічыш, настаўніца сёння была несправядлівай? Чаму?
20. Калі б заўтра ты стаў настаўнікам, што б ты зрабіў?

**Падрыхтавала Наталля МАЎЧАНАВА**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

П А К А Ш Т У Й Ц Е !

## «Ружы» з бліноў



***Спатрэбіцца:*** *яйка курынае — 2 шт., мука — 2 ст. л., крухмал — 2 ст. л., соль (дробка), малако — 250 мл, алей — 1 ст. л., шакалад — 50 г, цукар (+ каляровы для ўпрыгожвання) — 50 г, масла сметанковае — 50 г.*

Яйкі разбоўтаць з дробкай солі. Дадаць муку і крухмал, змяшаць. Паступова ўвесці малако і добра змяшаць да аднастайнасці. Затым уліць алей.

Пасмажыць тонкія блінцы. Кожны гатовы блін прамазаць маслам і пасыпаць цукрам. Блін скласці напалову, затым яшчэ напалам. Затым разрэзаць, як паказана на фота. З кожнага бліна атрымаецца 2 ружы: маленькая і вялікая.





Шакалад растапіць на вадзяной лазні. Можна выкарыстоўваць яркі густы джэм. Атрыманае «блін-кальцо» разразаем з аднаго боку. На край бліна пэндзлікам наносім шакалад або джэм. Затым згортваем рулетам, фармуючы ружу.

Затым выкладваем ружы на талерку і ўпрыгожваем па жаданні.

У М Е Л Ы Я  Р У Ч К І

## Салодкі падарунак



Прыгожая каробка цукерак — гэта, безумоўна, прыемна, але даволі банальна. А прыклаўшы трохі старання, можна і звычайныя цукеркі падарыць з асаблівай вытанчанасцю ў выглядзе торта.

***Нам спатрэбіцца:*** кавалак пенапласту або любога іншага шчыльнага матэрыялу; гафрыраваная папера розных колераў і адценняў; клей ПВА (можна выкарыстоўваць гарачы пісталет); скотч двухбаковы; цукеркі (любыя).

З пенапласту выразаем круглую аснову неабходнага дыяметра. Можна зрабіць аснову і з кардону ці выкарыстоўваць гатовую, напрыклад, пачак з-пад пячэння ці цукерак. Што датычыцца формы вырабу, то тут таксама ніякіх абмежаванняў.

Атрыманую нарыхтоўку абклейваем паперай. Колер выбіраем у залежнасці ад тону этыкетак цукерак. Замест паперы можна таксама выкарыстоўваць каляровую фольгу. Пасля абклейвання пакідаем наш будучы торцік падсохнуць на некалькі гадзін.



Каб торт выглядаў больш акуратным, кончыкі на абгортках цукерак з абодвух бакоў шчыльна закручваем. Іх не павінна быць відно.

Пасля таго, як аснова высахла, можна прыступаць да прыклейвання цукерак. Для гэтага бяром двухбаковы скотч і лепім яго на бакавую паверхню асновы. На яго мы і будзем мацаваць нашы цукеркі.




Ахоўную паперу з двухбаковага скотча можна здымаць не ўсю адразу, а па меры прыклейвання цукерак. Так мы пазбегнем наліпання непатрэбнага смецця, і клейкая аснова не высахне. Каб торт атрымаўся роўным і прыгожым, цукеркі трэба шчыльна размяшчаць адна да адной.



Калі ўсе цукеркі будуць на сваім месцы, неабходна ўпрыгожыць паверхню торта. Можна выкарыстоўваць розныя дэкаратыўныя элементы: папяровыя кветкі, мяккія цацкі і г. д. Не бойцеся прыдумляць, арыгінальнасць заўсёды вітаецца.

*КАХАННЕ НЕ ЦЕРПІЦЬ ТЛУМАЧЭННЯЎ. ЯМУ ПАТРЭБНЫЯ ЎЧЫНКІ (Эрых Марыя Рэмарк).*

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.